# Нашы юбіляры

## УЛАДЗІМІР КАНСТАНЦІНАВІЧ КОРШУК



Споўнілася 60 гадоў Уладзіміру Канстанцінавічу Коршуку, доктару гістарычных навук, прафесару.

Нарадзіўся У. К. Коршук 25 жніўня 1935 г. у г. п. Урэчча Любанскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і настаўнікаў.

З маленства на асабістым лёсе спытаў жахі вайны і звярыную сутнасць фашызму. Маці забілі гітлераўцы. Сам ён з бацькам у 1943—1944 гг. знаходзіўся ў партызанскім атрадзе, затым выхоўваўся ў Гомельскім дзіцячым доме.

У 1953 г. паступіў на гістарычны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта, пасля заканчэння якога выкладаў гісторыю ў 30-й сярэдняй школе г. Мінска.

З 1960 па 1971 г. працаваў у Беларускім палітэхнічным інстытуце, затым — у Мінскім дзяржаўным педінстытуце замежных моў.

У 1963 г. пасля заканчэння аспірантуры абараніў кандыдацкую, а ў 1980 г. — доктарскую дысертацыю. У 1982 г. яму прысвоена вучонае званне прафесара. З гэтага ж года загадвае кафедрай у Беларускім дзяржаўным універсітэце. Тут ён зарэкамендаваў сябе чулым і ўважлівым кіраўніком, выдатным педагогам і лектарам, умелым арганізатарам навукі.

Уладзімір Канстанцінавіч даследуе сацыяльна-эканамічную і палітычную гісторыю Беларусі, праблемы грамадскіх рухаў і палітычных партый, гісторыю Вялікай Айчыннай вайны. Ён аўтар ці сааўтар шэрагу манаграфій, навуковых і навукова-папулярных артыкулаў, вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў. Толькі за апошні час пад яго кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле выдадзены дапаможнікі для студэнтаў «Политическая история XX века», Мн., 1990; «З гісторыі палітычных партый», Мн., 1993; «Праграмныя дакументы палітычных партый», Мн., 1994. Больш за 130 апублікаваных работ — плён навуковай дзейнасці У. К. Коршука.

Прафесар У. К. Коршук падрыхтаваў 14 кандыдатаў навук, неаднаразова ўдзельнічаў у міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях, прачытаў курс лекцый ва Улан-Батарскім універсітэце (МНР).

У адносінах з калегамі і студэнтамі У. К. Коршук вызначаецца сапраўднай інтэлегентнасцю, нязменнай тактоўнасцю і разам з тым прынцыповасцю і патрабавальнасцю.

Выбіраўся дэпутатам Мінскага гарадскога савета. На працягу многіх гадоў з'яўляўся адказным рэдактарам трэцяй серыі «Весніка БДУ» (сёння — намеснік адказнага рэдактара), уваходзіць у склад рэдкалегіі «Беларускага гістарычнага часопіса», член шэрагу саветаў па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый.

адказнага рэдактара), уваходзіць у склад рэдкалегіі «Беларускага гістарычнага часопіса», член шэрагу саветаў па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый.

Уладзімір Канстанцінавіч узнагароджаны двума медалямі, Ганаровай граматай і граматамі Вярхоўнага Савета Беларусі, ганаровымі граматамі Міністэрства вышэйшай адукацыі, таварыстваў «Веды», знакам Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР «За выдатныя поспехі ў рабоце».

Калегі, вучні, супрацоўнікі, рэдакцыя часопіса «Веснік БДУ» сардэчна віншуюць Уладзіміра Канстанцінавіча з юбілеем і шчыра жадаюць добрага здароўя, асабістага шчасця і творчых поспехаў у працы.

## УЛАДЗІМІР НІЧЫПАРАВІЧ СІДАРЦОЎ



Споўнілася 60 год доктару гістарычных навук, прафесару, загадчыку кафедры крыніцазнаўства і музеязнаўства гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта Уладзіміру Нічыпаравічу Сідарцову.

Ён нарадзіўся 9 лістапада 1935 г. у вёсцы Клімаўка Гомельскага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і настаўнікаў. У 1953 г. скончыў Добрушскую сярэднюю школу. У 1958 г. з адзнакай скончыў гістарычны факультэт БДУ. Потым працаваў завучам у Міжлескай СШ, дырэктарам і настаўнікам Белаазёрскай СШ Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці, вучыўся ў аспірантуры Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта. У 1968 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю, а ў 1988 — доктарскую.

З 1966 г. У. Н. Сідарцоў працуе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце: выкладчыкам, старшым выкладчыкам, дацэнтам, прафесарам і загадчыкам кафедры. На яго рахунку каля 90 навуковых прац, у тым ліку манаграфіі «Класы і партыі ў перыяд Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі» (1971), «Практыкум па гісторыі савецкага грамадства» (1973), «Дзяржаўная дзейнасць рабочага класа БССР» (1978), раздзелы ў калектыўнай працы «Гісторыя рабочага класа Беларускай ССР. Т. 2» (1985), хрэстаматый па гісторыі Беларусі і БССР (1972, 1977, 1984) і інш. Ён — сааўтар шэрагу навучальных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі і ўсеагульнай гісторыі для сярэдняй школы. Узначальвае калектывы па падрыхтоўцы навучальных дапаможнікаў для ВНУ па метадалогіі гісторыі і гістарычнай інфарматыцы, дапаможнікаў па архівазнаўству і музеязнаўству Беларусі.

Пад кіраўніцтвам У. Н. Сідарцова ўпершыню на Беларусі пакладзены пачатак падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў архівістаў і музеязнаўцаў, а таксама новаму напрамку гістарычнай навукі і выкладання гісторыі — гістарычнай інфарматыкі. Ён з'яўляецца ініцыятарам, арганізатарам і кіраўніком Беларускай асацыяцыі «Гісторыя і камп'ютэр — галіны АГК» (Асацыяцыі «Гісторыя і камп'ютэр» — СНД). Імя У. Н. Сідарцова добра вядома як сярод гісторыкаў нашай краіны, так і іншых краін.

Жадаем юбіляру шчасця, поспехаў у яго карыснай для рэспублікі творчай працы і добрага здароўя.